Гаўрусёў В.

# САНДАМІРСКІ ПЛАЦДАРМ

Дрыбіншчына – адзін з маляўнічых куткоў Магілёўскай вобласці – стала калыскай кагорты шырока вядомых у нашай дзяржаве хлебаробаў і паэтаў, настаўнікаў і вучоных, дзяржаўных асоб высокага рангу і легендарных шапавалаў. Гістарычна сталася так, што адміністрацыйна Дрыбінскі раён то ствараўся, то распадаўся зноў. Але сыны і дочкі дрыбінскай зямлі, што нарадзіліся і зрабілі першыя крокі ў шырокай і раздольнай пойме ціхаплыннай Проні ці некалі выключна чысцюткай Галышы, задумлівай Басі ці сціплай Расты, захавалі ў сваіх сэрцах толькі самае дарагое, вясёлкавае, незабыўнае, шчаслівае і трапяткое.

Адным з яе праслаўленых сыноў быў Іван Адамавіч Лапянкоў з вёскі Яськаўшчына. Нарадзіўся ён 15 студзеня 1912 года. Першае баявое хрышчэнне будучы герой атрымаў у час кароткай, але выключна крывавай савецка-фінскай вайны 1939-1940 гг. Івану Адамавічу Лапянкову было суджана прайсці цярністыя вогненныя вёрсты на Заходнім, Калінінскім, 1-м Украінскім і 1-м Беларускім франтах у векапомнай Вялікай Айчыннай.

У канцы ліпеня 1944 года батальён, якім камандаваў Іван Адамавіч Лапянкоў, падыйшоў да берага ракі Віслы. Ноччу быў атрыманы загад: на досвітку фарсіраваць Віслу, авалодаць дамбай і ўмацаваным раёнам на заходнім беразе і забяспечыць пераправу ўсёй брыгады. Камбат Лапянкоў аддаў загад рыхтавацца да пераправы. У распараджэнні была ўсяго адна лодка, прадастаўленая дзедам-палякам, ды яшчэ некалькі дошак. Першая група на чале з камбатам села ў лодку, а за ёй паплылі астатнія, хто на чым. Але да гэтага часу наступіла світанне. Начны час быў упушчаны. Цяпер уся рака і доступы да яе праглядваліся праціўнікам. Неўзабаве ў бок смельчакоў паляцелі міны, снарады, а затым у небе з’явіліся варожыя бамбардзіроўшчыкі.

Навокал усё ірвалася, вада бурліла, быццам у кіпячым катле. Смерць бязлітасна касіла людзей. Але ніхто не павярнуў назад. Хто застаўся жывы, дасягнуў заходняга берага ракі і там умацаваўся. Неўзабаве ўвесь батальён закончыў пераправу і акапаўся.

Разведка данесла, што сілы праціўніка пераўзыходзяць нашы ўтрая. Праз некаторы час фашысты пайшлі ў атаку і працягвалі яе тры гадзіны. Ім удалося пацясніць батальён да берага. Тады камбат І.А. Лапянкоў выклікаў па рацыі артылерыстаў і папрасіў адкрыць агонь.

Артылерысты адсеклі фашыстаў і прымусілі іх залегчы.

У гэты час камбат І.А. Лапянкоў падняў батальён у атаку, папрасіўшы артылерыстаў перанесці агонь у глыб праціўніка. Пры такім узаемадзеянні ўдалося выбіць праціўніка з дамбы і іншых умацаванняў.

30 жніўня плацдарм быў расшыраны да 75 кіламетраў па фронту і да 60 кіламетраў у глыбіню. Пасля гэтага батальён І.А. Лапянкова атрымаў загад наступаць на горад Сандамір, дзе заселі ўдарныя сілы фашыстаў. У дапамогу далі танкі, артылерыю. Наступленне пачалося вераснёўскай раніцай 1944 года.

Спачатку нашаму руху перашкаджала авіяцыя праціўніка. Потым савецкія лётчыкі завалодалі небам. Але наступленню перашкаджалі агнявыя кропкі. І.А. Лапянкоў загадаў камандзіру танкавага ўзвода падавіць іх. Танкісты завязалі бой. А тым часам батальён пайшоў на злучэнне з 38-й арміяй.

Як толькі закончылася акружэнне Сандаміра, 38-я армія ўварвалася ў горад, сюды падаспела 1-я армія. Сандамір быў вызвалены савецкімі воінамі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Пры гэтым было ўзята ў палон каля 6 тысяч салдат і афіцэраў нямецкай арміі, шмат танкаў, самаходных гармат, аўтамашын, коней і іншых трафеяў.

За фарсіраванне ракі Віслы і ўзяцце Сандаміра камандзіру мотастралковага батальёна гвардыі капітану Івану Адамавічу Лапянкову і яшчэ пяці салдатам і афіцэрам 23 верасня 1944 гада Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

Пасля вайны Іван Адамавіч Лапянкоў працаваў у Ачынскім аддзяленні Дзяржбанка. І у мірны час мужны воін карыстаўся і павагай, і аўтарытэтам калектыву, неаднаразова выбіраўся дэпутатам Ачынскага гарсавета, членам гаркама партыі, старшынёй мясцкама, сакратаром пярвічнай партыйнай арганізацыі.

Памёр Герой Савецкага Саюза Іван Лапянкоў 6 снежня 1972 года.

Яго імем названа адна з вуліц Ачынска. На доме, у якім ён жыў, устаноўлена мемарыяльная дошка.

**Гаўрусёў, В. Сандамірскі плацдарм / Віктар Гаўрусёў // Савецкая вёска (Дрыбін). — 2004. — 19 чэрвеня. — С. 2.**